# Гацук: з месца ў кар’еру

Статыстыка — рэч вельмі змястоўная і красамоўная, але за кожнай лічбай і прозвішчам — чалавечы лёс. “К” вырашыла ці не пад лупай разгледзець адзін з іх — шлях Паліны Панамаровай, выпускніцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, што летам 2015 года накіравалася ў Падлескі сельскі дом культуры Слуцкага раёна на пасаду мастацкага кіраўніка разам са сваім калегам Уладзіславам Палянскім, які па плане павінен быў узначаліць гэтую установу (пачатак гісторыі — “К” №28 за мінулы год), але абавязак перад радзімай трошкі змяніў курс хлопца.



Паліна Панамарова за творчай...

Паліну ж, з дапамогай ужо знаёмай мне дырэктара Раённага цэнтра народнай творчасці Таццяны Івановай, я знайшла не ў Падлессі, як планавалася, а ў аграгарадку Гацук, які знаходзіцца за 35 кіламетраў ад Слуцка. Працуе яна там дырэктарам Дома фальклору. Месца працы змянілі з некалькіх прычын: па-першае, заставацца адной у велізарным будынку Падлескага СДК падалося выпускніцы неяк няўтульна, па-другое, ад Гацука да Мінска значна лягчэй дабірацца. Рашэнне было прынята з дапамогай метадычнага аддзела РЦК на карысць Паліны.

■■■

Некалькі рэмарак пра маладую дырэктарку. Родам яна з расійскай Самары, шмат павандравала з сям’ёй, але заўсёды — па буйных гарадах. На час вучобы ў ВНУ Паліна вырашыла прыпыніцца ў Мінску. Скончыўшы БДУКіМ як менеджар міжнародных культурных сувязей, пасля ўніверсітэта яна ўяўляла сабе арганізатарам культурных праектаў, але рэальнасць перасягнула ўсе Палініны чаканні.



Імправізаваны музей, створаны выхаванцамі Дома фальклору.

■■■

Заўсёды цікава, ці рыхтуюць сталічных студэнтаў за 4 гады да працы ў рэгіёнах. Паліна падзялілася, што яе заўсёды вабілі буйныя міжнародныя праекты Мінска, у якіх яна прымала ўдзел як валанцёр. Прайсці практыку на раёне таксама можна было б, але, кажа, гэта не дужа цікава і прыярытэтна для моладзі.

Таму, калі надышоў “час Х”, яна спярша разглядала варыянты пераразмеркавання ды шукала альтэрнатыву. “Фіктыўна выйсці замуж і тым самым выратаваць сябе мне не дазволілі асабістыя перакананні. Таму я вырашыла інакш: трэба адмежавацца ад масавай істэрыі і перастаць бегчы ад таго, чаго проста не ведаеш”, — паведаміла гераіня. Невядомым аказалася разнапланавая работа, дзе можна рэалізаваць сябе і як менеджар, і як творца, і як педагог, і як этнограф — магчымасці шырокія. Сапраўднай жа праблемай бачыцца тое, што ў Мінску сутнасць складанай і спецыфічнай працы ў раёне тлумачаць збольшага ў агульных рысах, бо і самі выкладчыкі з гэтай сферай судакранаюцца збольшага ў тэорыі. Усе тонкасці ўчарашнія студэнты “хапаюць” на месцы. З іншага боку, ці не ў гэтым хараство маладосці: хутка арыентавацца, знаходзіць у сабе рэзервы, нестандартна думаць?

У выпадку з Палінай Панамаровай мясцовае кіраўніцтва было само зацікаўлена ў маладым спецыялісце, стварыўшы ёй максімальны камфорт, які толькі можна арганізаваць ва ўмовах аграгарадка: двухпакаёвая кватэра па цане “камуналкі”, адрамантаваны дом фальклору з дзейнай сістэмай ацяплення. Ну і галоўнае: кругласутачная сувязь з падапечнай, спагадлівасць і жаданне дапамагчы.

“Мне давялося вывучаць, што такое сельская мясцовасць. Я абсалютна гарадскі чалавек, мяне ніколі не адпраўлялі на лета ў вёску да бабулі, таму і элементарныя рэчы былі ў навінку: як набраць ваду з калодзежа, скажам. А ў Падлессі гэта спатрэбілася, у Гацуку ж ёсць калонка. Не ведала, чым адрозніваецца калгас ад сельсавета. Карацей, трапіла ў нейкі асобны свет”, — Паліна распавядае, мы разам смяемся, але я разумею, што на яе месцы першыя дні была б такой жа бездапаможнай. Праўда, зараз дзяўчына выглядае вельмі ўпэўненай, поўнай годнасці і спакою.

Што да прафесійнай сферы, то ў яе маецца куратар ад Цэнтра народнай творчасці Слуцкага раёна, які адказвае на кожнае зададзенае пытанне. Хаця Паліна запэўнівае, што ёй “займаюцца ўсе”.

■■■

Акалічнасць, якая “ўсплыла” толькі падчас размовы: штат у Гацукоўскім доме фальклору складаецца… толькі з Паліны. Не, канешне, у яе яшчэ ёсць тэхнічны персанал (два качагары), што візаві падкрэслівала, але па факце дырэктар выконвае ўсе адміністрацыйныя, арганізатарскія і творчыя функцыі, а менавіта: кіруе 5 клубнымі фарміраваннямі (4 з іх — дзіцячыя); ладзіць шэраг стандартных мерапрыемстваў (кшталту святочных канцэртаў) ды нефармальных (псіхалагічныя трэнінгі для моладзі, скажам). Адразу наогул ставала запалу, але зараз Паліна больш удумліва падыходзіць да працы, расстаўляе прыярытэты. (Калі нумар здаваўся ў друк, “К” даведалася, што ў Дом фальклору ўладкавалася дзяўчына на стаўку мастацкага кіраўніка. Спадзяемся, што ўдваіх працавацца будзе весялей, лягчэй і больш прадуктыўна).



...і адміністрацыйнай працай.

“Фінансамі займаецца бухгалтэрыя ў Слуцку. Як і ва ўсіх установах, у Доме фальклору ёсць платныя паслугі: дыскатэкі, некаторыя мерапрыемствы. Трэба выканаць план — 20 мільёнаў за год. У такім выпадку вельмі дапамагаюць менавіта дыскатэкі”, — кажа візаві. Дарэчы, вечарыны ў Гацуку былі настолькі шырока прарэкламаваны Палінай у Сеціве, што сюды прыязджаюць нават з Мінска. “А вось на канцэртах я зарабляю сваю рэпутацыю сярод насельніцтва, таму браць грошы за іх з людзей пакуль не хочацца”, — зазначае Паліна. Мне такі падыход падаецца вельмі дальнабачным. І чамусьці я ўпэўнена, што Паліна Панамарова, хаця і пачатковец у культуры, але працу сваю робіць на ўзроўні. Гэта пацвярджаюць і старэйшыя калегі.

■■■

Гацук — не такі і вялікі населены пункт, усяго 1260 жыхароў. Але ён мае ўласную агульнаадукацыйную школу, прычым — з экалагічным ухілам, і школу мастацтваў. З дырэктарамі гэтых устаноў Паліна Панамарова адразу

**Адзін мой сябар пажартаваў, разыграўшы дыялог: “Як ты рыхтуешся да размеркавання?” — “Ну, гляджу “Падарожжы дылетанта”. (Дарэчы, гэты салігорскі хлопец адкараскаўся спалохам: яго ўзялі на прэстыжную пасаду ў Мінску). Але жарту тут — працэнтаў на 15, астатняе — праўда. Штогод маем інфармацыю ад ВНУ, колькі запытаў прыходзіць, ад якіх арганізацый і ўстаноў, з якіх населеных пунктаў. І, самае цікавае, колькі маладых спецыялістаў гатова паехаць (і даехаць) на месца, каб сумленна адпрацаваць там два гады, а мо застацца і надалей.**

Аліна САЎЧАНКА, Мінск — Слуцкі раён — Мінск / Фота аўтара

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ